Д. В. Дзятко

БЕЛАРУСКАЯ ЛІНГВІСТЫЧНАЯ ТЭРМІНАГРАФІЯ

Слоўнік

Мінск
«Колорград»
2022

УДК 811.161.3'373.46'374
ББК 81.2Беи-4
Д43

Рэкамендавана да друку кафедрай мовазнаўства
і лінгвадыдактыкі ўстановы адукацыі
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»
(пратакол № 6 ад 21.12.2021)

Навуковы рэдактар
В. Д. Старычонак, доктар філалагічных навук

Рэцэнзенты:
Н. В. Пятаева, доктар філалагічных навук;
В. М. Лухверчык, кандыдат філалагічных навук;
В. В. Урбан, кандыдат філалагічных навук;
С. У. Шахоўская, кандыдат філалагічных навук

Дзятко, Д. В.

Д43 Беларуская лінгвістычная тэрмінаграфія : слоўнік / Д. В. Дзятко ; навук. рэд. В. Д. Старычонак. – Мінск : Колорград, 2022. – 208 с.

ISBN 978-985-896-090-2.

Слоўнік уключае тэрміны, якія выкарыстоўваюцца для апісання беларускай лінгвістычнай тэрмінаграфіі. У слоўнікавых артыкулах раскрываецца іх значэнне, падаюцца неабходныя каментарыі і ілюстрацыі, адлюстроўваецца ўзаемасувязь тэрмінаў, прыводзяцца альтэрнатыўныя найменні.

Адрасуецца даследчыкам у галіне тэрмінаграфіі, лексікаграфіі, тэрміназнаўства, выкладчыкам, аспірантам, студэнтам вышэйшых навучальных устаноў.

УДК 811.161.3'373.46'374
ББК 81.2Беи-4

ISBN 978-985-896-090-2

© Дзятко Д. В., 2022
© Афармленне.
ТАА «Колорград», 2022

З М Е С Т

Прадмова 4

Гіпера-гіпанімічны навігатар 10

КОРПУС ТЭРМІНАЎ 18

Паказальнік тэрмінаў 168

Паказальнік асоб 186

Паказальнік выданняў 189

Этымалогія запазычаных тэрмінаў і іх кампанентаў .. 191

Слоўнікі лінгвістычных тэрмінаў 199

Прадмова

Характэрнай асаблівасцю навуковага светапогляду ў сучасным грамадстве з'яўляецца лексікаграфічная ўстаноўка не толькі спецыяльнага, але і мастацкага дыскурсу. Невыпадкова слоўнікавая форма і лексікаграфічная праблематыка запатрабаваны ў інтэлектуальнай літаратуры[1].

Па словах А. В. Падучавай, нават складваецца ўражанне, што ў эпоху ўзрастання энтрапіі алфавіт застаецца адзіным гарантам парадку[2]. Таму навуковыя дысцыпліны, звязаныя з сістэматызацыяй, упарадкаваннем, кадыфікацыяй моўных адзінак, набываюць асаблівае значэнне. Тэарэтычная лексікаграфія, тэрміназнаўства, тэрмінаграфія ў апошнія дзесяцігоддзі развіваюцца надзвычай дынамічна.

Любая навука не можа паспяхова існаваць і эвалюцыянаваць без выпрацоўкі стройнай сістэмы метадаў, прыёмаў і прынцыпаў інтэрпрэтацыі фрагментаў рэчаіснасці. Вынікам гэтага стала імклівае павелічэнне колькасці спецыяльных паняццяў і адпаведных тэрмінаў для іх пазначэння.

Разам з тым практыка паказвае, што тэрмінасістэма не ўзнікае выпадкова, а фарміруецца шляхам працяглай селекцыі тэрмінаадзінак, створаных рознымі даследчыкамі і цэлымі навуковымі школамі.

Слоўнік тэрмінаў беларускай лінгвістычнай тэрмінаграфіі стаў вынікам тэарэтычнага вывучэння дзясяткаў іншых слоўнікаў, у якіх адлюстравана мовазнаўчая тэрміналогія. Асноўнай крыніцай для назіранняў і абагульненняў паслужыў тэрмінаграфічны корпус (116 адзінак), у які ўваходзяць:

1) аўтаномныя слоўнікі лінгвістычных тэрмінаў, што выдадзены на тэрыторыі Беларусі беларускімі вучонымі і ўключаюць матэрыял беларускай мовы (часам побач з матэрыялам рускай, польскай, кітайскай і іншых моў);

2) аўтаномныя слоўнікі лінгвістычных тэрмінаў, якія апублікаваны па-за межамі Беларусі вучонымі іншых краін або аўтарскімі калектывамі, у склад якіх уваходзілі беларускія і замежныя вучоныя, і ўключаюць беларускі матэрыял;

3) інкарпараваныя слоўнікі тэрмінаў, якія ўключаюць беларускі матэрыял, укладзены беларускімі і замежнымі вучонымі, апублікаваны як на тэрыторыі Беларусі, так і за яе межамі.

---

[1] Напрыклад: "Пра слоўнік" Жуакіна Марыі Машада дэ Асіса (1899), "Хазарскі слоўнік" Міларада Павіча (1984), "Скіфскі слоўнік" Георгія Хазагерава (1999), "Запіскі і выпіскі" Міхаіла Гаспарава (2000), "Сабакі Эўропы" Альгерда Бахарэвіча (2017) і інш.

[2] Падучева, Е. В. Динамические модели в семантике лексики / Е. В. Падучева. – М. : Школа "Яз. славян. культуры", 2004. – С. 18.

У слоўнік уведзена значная частка (больш за палову ад агульнай колькасці рэестравых адзінак) аўтарскіх тэрмінаў, якія былі сканструяваны і апрабіраваны пры падрыхтоўцы манаграфічнага даследавання, прысвечанага беларускай лінгвістычнай тэрмінаграфіі[3]. Такое рашэнне абумоўлена трыма прычынамі.

Па-першае, прапанаваныя тэрміны пераважна не маюць пашыраных адпаведнікаў у тэрмінаграфіі і тэрміназнаўстве.

Па-другое, у сваёй сукупнасці гэтыя тэрміны дазваляюць *сістэмна* апісаць абраную тэрмінасістэму.

Па-трэцяе, мы разлічваем, што большасць прапанаванай тэрміналагічнай лексікі застанецца ў навуковым выкарыстанні, а ўсё "штучнае, непрыгоднае, неўласьцівае да беларускай мовы" з далейшым развіццём навукі выйдзе з ужытку[4].

Структура Слоўніка складаецца з некалькіх частак: "Прадмова", "Гіперагіпанімічны навігатар", корпус тэрмінаў, а таксама шэраг дадаткаў ("Паказальнік тэрмінаў", "Паказальнік асоб", "Паказальнік выданняў", "Этымалогія запазычаных тэрмінаў і іх кампанентаў", "Слоўнікі лінгвістычных тэрмінаў").

Корпус слоўніка фарміруецца 493 рэестравымі адзінкамі, 305 з якіх апісваюцца ў самастойных (даменных) слоўнікавых артыкулах, размешчаных паводле алфавіта.

Тыповы слоўнікавы артыкул складаецца з шэрага кампанентаў:

– рэестравая адзінка (зона намінацыі);

– дэфініцыя (зона семантызацыі);

– неабходныя каментарыі і выпадкі выкарыстання рэестравай адзінкі (сумешчаныя зона ілюстрацый і зона лінгвадыдактычнай інфармацыі);

– адлюстраванне сувязей тэрміна з іншымі тэрмінамі (зона сістэмнай інфармацыі);

– магчымыя альтэрнатыўныя найменні (паліморфы).

У слоўніку аддаецца перавага тэрмінам з фіналлю "-цыйн(ы)". Разам з тым пад уплывам традыцыі і дзеяння закона аналогіі ў некаторых выпадках захоўваюцца тэрміны на "-тыўн(ы)": "ад'юнктыўны", "генератыўны", "дырэктыўны", "дэнататыўны", "дэскрыптыўны", "кагнітыўны", "квантытатыўны", "прэскрыптыўны", "сігніфікатыўны", "экскрэтыўны" і інш. Паслядоўная дыферэнцыяцыя праводзіцца паміж тэрмінамі "канструктыўны" і "канструкцыйны", "прадуктыўны" і "прадукцыйны", "праектыўны" і "праекцыйны", "пазітыўны" і "пазіцыйны", "субстантыўны" і "субстанцыйны".

---

[3] Дзятко, Д. В. Беларуская лінгвістычная тэрмінаграфія : манагр. / Д. В. Дзятко ; нав. рэд. В. Д. Старычонак. – Мінск: Выд-ва БДПУ, 2022. – 340 с.

[4] Некрашэвіч, С. Да пытаньня аб укладаньні слоўніка жывой беларускай мовы / С. Некрашэвіч. – Менск : Ін-т Беларускае культуры, 1925. – С. 12.

Структура слоўнікавага артыкула

1. Загалоўная адзінка (лема)

У рэестр слоўніка ўключаны аднакампанентныя, бікампанентныя і полікампанентныя тэрміны.

Аднакампанентныя тэрміны з'яўляюцца назоўнікамі. Бі- і полікампанентныя тэрміны падаюцца ў адпаведнасці з прыёмам аднанакіраванага лінейнага мадэлявання. Гэта значыць, структура тэрміна ў рэестры разгортваецца паводле лагічных адносін паміж кампанентамі: да базавага кампанента дадаецца перыферыйны кампанент, да іх адзінства далучаецца другасны перыферыйны кампанент, адзінства базавага і перыферыйных кампанентаў развіваецца перыферыйнымі кампанентамі трэцяга парадку і г. д., напрыклад: тэрмін "аднанакіраваны прагрэсіўны кластар адрасацыі" ў рэестры прадстаўлены як "кластар адрасацыі аднанакіраваны прагрэсіўны".

2. Дэфініцыя

Азначэнне тэрміна фармулюецца з дапамогай сказа, які ўтварае адзінае цэлае з адпаведнай рэестравай адзінкай. Пры наяўнасці гіпера-гіпанімічных адносін тэрміна з іншымі адзінкамі тэрмінасістэмы ў дэфініцыі, як правіла, указваецца адпаведны гіперонім, напрыклад: "Характарызатар актыўны – тып характарызатара прагматычнага <...>". Пры гэтым лема "характарызатар прагматычны" сама вызначаецца, як пэўны тып характарызатара. У выніковай схеме адносін "характарызатар актыўны" – гэта падтып характарызатара прагматычнага і тып характарызатара.

3. Каментарыі і ілюстрацыі

Аўтарскія каментарыі пры неабходнасці змяшчаюцца ў тэкставым блоку, які падаецца пасля дэфініцыі. Усе ілюстрацыі прыводзяцца са слоўнікаў, уключаных у дадатак ("Слоўнікі лінгвістычных тэрмінаў"). Як правіла, слоўнікавыя артыкулы, якімі ілюструецца лема, нязначна спрашчаюцца, каб не адцягваць увагу на неістотныя ў дадзеным выпадку дэталі. Пры наяўнасці ў ілюстрацыях нетыповых тэрмінаграфічных рашэнняў указваецца адпаведны слоўнік, яго аўтар(-ы) і год выдання.

4. Сістэмная інфармацыя

Месца рэестравага тэрміна ў тэрмінасістэме акрэсліваецца ў адпаведнасці з "Гіпера-гіпанімічным навігатарам". Пры гэтым па магчымасці адзначаецца тэрмін вышэйшага парадку – гіперонім (▲), а таксама тэрміны, у дачыненні да

якіх рэестравая адзінка з'яўляецца гіперонімам (▼)[5]. Фіксуюцца і тэрміны аднаго ўзроўню з рэестравым (◄►).

5. Альтэрнатыўныя найменні

Варыянты і сінонімы (дублеты), або т. зв. паліморфы, падаюцца (пры іх наяўнасці) у канцы слоўнікавага артыкула (≈).

Колькасць тэрмінаў-дублетаў у лінгвістычнай тэрмінаграфіі неістотная: "дэфініендум" – "азначанае", "дэфініенс" – "азначальнае", "слоўнік тэрмінаў актыўны" – "слоўнік тэрмінаў прадуктыўны" і інш. Пераважная большасць тэрмінаў, якія часам выкарыстоўваюцца ў якасці эквівалентных, адрозніваюцца адценнямі значэння, функцыянальнымі або дэрывацыйнымі характарыстыкамі: "бібліяграфія" – "літаратура", "корпус" – "кантэнт", "параметрызацыя" – "мадэляванне параметрычнае" і інш. Такія тэрміны не пазіцыянуюцца як узаемазамяняльныя ў дачыненні да лемы і фіксуюцца толькі з мэтай рэгістрацыі. Рэкамендаваныя формы выносяцца ў рэестр.

Метамова слоўніка

шрыфт паўтлусты	рэестравая адзінка (лема): "**НАМІНАТАР** – ключавы фрагмент *дэфініцыі*, які служыць для вызначэння дэфініендума";
шрыфт курсіўны	кантэнтная адсылка; тэрмін (звычайна гіперонім) у складзе дэфініцыі, які апісваецца ў слоўніку: "**ТЭКСТАЛОГІЯ ТЭРМІНАГРАФІЧНАЯ** – напрамак *метатэрмінаграфіі*, прадметам якога з'яўляецца параўнанне розных выданняў аднаго і таго ж слоўніка, розных слоўнікаў, атрыманых з агульнай першаснай або другаснай крыніцы ці з розных слоўнікаў аднаго і таго ж выдаўца <...>", "**МЕТАТЭРМІНАГРАФІЯ** – раздзел *тэрмінаграфіі*, які займаецца распрацоўкай яе тэарэтычных праблем <...>";
шрыфт падкрэслены	фрагмент ілюстрацыі, на якім акцэнтуецца ўвага: "**ФУНКЦЫЯ СПЕЦЫФІКАЦЫІ** – акрэсліць тэматычнае поле ў рэестравым слоўніку пры падрыхтоўцы слоўнікавых артыкулаў для будучых энцыклапедычных выданняў: «азначэнне (у мовазнаўстве)», «канвергенцыя (у мовазнаўстве)» і інш.";

[5] Паняцце "гіпера-гіпанімічныя адносіны" ў слоўніку інтэрпрэтуюцца ў пэўнай ступені ўмоўна. Напрыклад, відавочна, што тэрміны "зона бібліяграфіі", "зона дэрывацыі", "зона ілюстрацыі", "зона лакалізацыі", "зона намінацыі" і інш. з'яўляюцца відавымі ў дачыненні да тэрміна "зона інфармацыі". У той жа час тэрміны "функцыя зоны інфармацыі інтраканекцыйная", "функцыя зоны інфармацыі экстраканекцыйная", якія маюць прамое дачыненне да тэрміна "зона інфармацыі", пры строгім, традыцыйным падыходзе ўсё ж не з'яўляюцца яго гіпонімамі. Аднак з мэтай уніфікацыі і спрашчэння выкладу адносіны паміж групамі названых паняццяў падрабязна не градуіруюцца і разглядаюцца ў кантэксце агульнага тэрміна "зона інфармацыі". Адзначанае актуальна і ў шэрагу іншых выпадкаў (гл. "Гіпера-гіпанімічны навігатар").

↔	“гл.”; адсылка да слоўнікавага артыкула, у якім апісваецца адпаведнае паняцце: “**АЗНАЧАНАЕ ↔ ДЭФІНІЕНДУМ**”, “**ДЭФІНІЕНДУМ** – «знешні» кампанент дэфініцыі, значэнне якога раскрываецца ў зоне семантызацыі слоўнікавага артыкула <...>”;
=	абмежаванне адноснай тоеснасці тэрмінаў адным са значэнняў: “**АЛФАВІТ** – азбука (= значэнне 1)”, “**ЛЕКСІКАГРАФІЯ** – слоўніказнаўства (= значэнне 1), слоўніцтва (= значэнне 2)”;
/	раўнапраўныя адносіны паміж адзінкамі ў пераліку тэрмінаў: “<...> паказальнік алфавітны / паказальнік імянны / паказальнік тэматычны <...>”;
*	рэканструяваная або гіпатэтычна магчымая форма: “эквівалент (сказа, слова) – *эквівалент сказа, *эквівалент слова”;
...	адкрыты рад у пераліку тэрмінаў: “фрагмент артыкула слоўнікавага, частка артыкула слоўнікавага, ...”, “слоўнік лексікі дыялектнай / слоўнік фразеалагізмаў / ...”;
↗	пашырэнне семантычнага аб’ёму: “раздзел навукі ↗ навука”, “факт маўлення ↗ прыём маўлення”;
↘	звужэнне семантычнага аб’ёму: “знакавая сістэма ↘ валоданне знакавай сістэмай”, “раздзел навукі ↘ аспект раздзела навукі”;
‖	паралельнасць (неперасякальнасць) семантычнага аб’ёму: “адзінка мовы ‖ адзінка мовы”, “прадмет (асоба) ‖ кампанент адзінкі мовы”;
▲	гіперонім да рэестравай адзінкі: “**ПАРАМЕТРЫЗАЦЫЯ СЕМАНТЫЧНАЯ** – <...> ▲ параметрызацыя”, “**ХАРАКТАРЫЗАТАР КАМПАНАЦЫЙНЫ** – <...> ▲ характарызатар”;
▼	гіпонім(-ы) да рэестравай адзінкі: “**АРТЫКУЛ СЛОЎНІКАВЫ** – <...> ▼ артыкул слоўнікавы даменны / артыкул слоўнікавы субсідарны”, “**РЭЕСТР** – <...> ▼ субрэестр”;
◄►	тэрміны, звязаныя з рэестравай адзінкай адносінамі аднаго парадку: “**АСІСТЭМНАСЦЬ СУБРЭЕСТРАВАЯ ГІБРЫДНАЯ** – <...> ◄► асістэмнасць інтрасубрэестравая / асістэмнасць экстрасубрэестравая”, “**ЭКСПЛІКАЦЫЯ** – <...> ◄► фамілізацыя / цытацыя / экзэмпліфікацыя”;

→	адна з некалькіх груп такіх тэрмінаў (асобны тэрмін), якія звязаны паміж сабой адносінамі аднаго парадку і з'яўляюцца гіпонімамі ў дачыненні да рэестравай адзінкі: “**АРТЫКУЛ СЛОЎНІКАВЫ** – <...> → артыкул слоўнікавы даменны / артыкул слоўнікавы субсідарны; → зона інфармацыі”;
≈	набліжанасць семантычнага аб'ёму двух або некалькіх тэрмінаў: “**ДЭФІНІЦЫЯ** – <...> ≈ азначэнне, тлумачэнне”, “**СЛОЎНІК-ДАДАТАК** – <...> ≈ слоўнік ад'юнктыўны”;
{ }	тэрміны, якія катэгарычна не рэкамендуюцца ў якасці ўзаемазамяняльных: “**ІНДЫКАТАР ПУНКТУАЦЫЙНЫ** – {знакі прыпынку}”, “**СЛОЎНІК** – {вакабуляр, лексікон, тэзаўрус}”, “**ТЭРМІНАЗНАЎСТВА** – {тэрміналогія}”

Аўтар шчыра ўдзячны навуковаму рэдактару слоўніка доктару філалагічных навук В. Д. Старычонку, доктару філалагічных навук Н. В. Пятаевай, кандыдатам філалагічных навук В. М. Лухверчык, В. В. Урбан, С. У. Шахоўскай за ўважлівае прачытанне работы і слушныя заўвагі.

Гіпера-гіпанімічны навігатар

Спецыяльныя адзінкі групуюцца вакол васьмі ключавых паняццяў: "I. ТЭРМІН", "II. ЛЕКСІКАГРАФІЯ", "III. СЛОЎНІК", "IV. МЕГАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА", "V. МАКРАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА", "VI. МЕТАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА", "VII. МІКРАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА", "VIII. ПАРАМЕТРЫЗАЦЫЯ". Нумаральнымі індыкатарамі (1, 2, 3, ...) пазначаецца адна з некалькіх груп такіх тэрмінаў (асобны тэрмін), якія звязаны паміж сабой адносінамі аднаго парадку і (умоўна) з'яўляюцца гіпонімамі ў дачыненні да адзінкі з больш агульным зместам. Аўтарскія тэрміны падаюцца ў прамых дужках: [ ].

I. ТЭРМІН

1 ├тэрмінаграфаванне
2 ├тэрміназнаўства
3 ├тэрміналогія
  └[кантынуум тэрміналагічны лінгвістыкі беларускай]
4 └тэрмінасістэма

II. ЛЕКСІКАГРАФІЯ

1 ├металексікаграфія
2 └тэрмінаграфія
  1 ├[кантынуум тэрмінаграфічны лінгвістыкі беларускай]
  2 ├метадалогія тэрмінаграфічная
    └методыка тэрмінаграфічная
      └тэхналогія тэрмінаграфічная
        └прыём тэрмінаграфічны
  3 ├метатэрмінаграфія
    ├гісторыя тэрмінаграфічная
    ├[кантэнталогія тэрмінаграфічная]
    ├крытыка тэрмінаграфічная
      └рэцэнзія тэрмінаграфічная
    ├прагматыка тэрмінаграфічная
    ├тыпалогія тэрмінаграфічная
    └тэксталогія тэрмінаграфічная
  4 └традыцыя тэрмінаграфічная нацыянальная
    └[апраксімацыя лексікаграфічная ідэнтыфікацыйная]

III. СЛОЎНІК

1 ├апісанне слоўніка бібліяграфічнае
2 ├праспект слоўніка
3 └слоўнік тэрмінаў
  1 ├гласарый
  2 ├мінімум тэрміналагічны
  3 ├прагматыка слоўніка тэрмінаў
    ├[параметр прызначэнне-адрасат]
    └[параметр прызначэнне-функцыя]
  4 ├серыя слоўнікаў тэрмінаў
  5 ├слоўнік тэрмінаў аўтаномны
  ├[слоўнік тэрмінаў інкарпараваны]
    ├слоўнік-дадатак
    └слоўнік-падборка
  6 ├слоўнік тэрмінаў вучэбны
  7 ├слоўнік тэрмінаў двух- або шматмоўны
    ├слоўнік тэрмінаў актыўны
    └слоўнік тэрмінаў пасіўны
  ├слоўнік тэрмінаў рэестравы
    └класіфікатар
  ├слоўнік тэрмінаў тлумачальны
    └стандарт
  8 ├тыпалогія слоўнікаў тэрмінаў
    ├[тыпалогія слоўнікаў тэрмінаў апазіцыянальная]
    ├[тыпалогія слоўнікаў тэрмінаў монакрытэрыяльная]
    └[тыпалогія слоўнікаў тэрмінаў полікрытэрыяльная]
      └[тыпалогія слоўнікаў тэрмінаў трохаспектная]
  9 └функцыя слоўніка тэрмінаў

IV. МЕГАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА

1 ├алфавіт
├бібліяграфія
  └[каэфіцыент шчыльнасці бібліяграфічнай]
├дадатак граматычны
├[дадатак экстралінгвістычны]
├змест
├кіраўніцтва па карыстанні
├корпус
  1 ├[корпус гамагенны]
  ├[корпус гетэрагенны]
    ├[корпус гетэрагенны біскапальны]
    ├[корпус гетэрагенны монаскапальны]
    └[корпус гетэрагенны поліскапальны]

1 [корпус гетэрагенны поліскапальны асіметрычны]
[корпус гетэрагенны поліскапальны сіметрычны]
[корпус гібрыдны]
2 корпус інтэнсіўны
корпус экстэнсіўны
3 рэестр
1 [мова інтрадукцыйная]
[мова экскрэтыўная]
2 [субрэестр]
[інтэграцыя субрэестраў]
3 [фарміраванне рэестра лексіконацэнтрычнае]
[фарміраванне рэестра тэкстацэнтрычнае]
дыскрэтызацыя
паказальнік
індэкс
паказальнік алфавітны
паказальнік імянны
паказальнік тэматычны
прадмова
[блок прадмовы інтрадукцыйны]
[блок прадмовы камунікацыйны]
[блок прадмовы лігаментацыйны]
[блок прадмовы перспектыўны]
[блок прадмовы рэтраспектыўны]
спіс скарачэнняў
2 [арганізацыя мегаструктуры кантынуальная]
[арганізацыя мегаструктуры сепарацыйная]

V. МАКРАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА

[макраструктура суб'ектыўна-аўтарская]
макраструктура тэматычная
макраструктура ідэаграфічная
макраструктура тэматычна-алфавітная
макраструктура фармальная
макраструктура алфавітная
1 макраструктура алфавітна-гнездавая
макраструктура татальна-алфавітная
2 макраструктура алфавітна-субардынацыйная
3 макраструктура пермутацыйная
макраструктура патэкставая
макраструктура частотная

VI. МЕТАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА

- метамова слоўніка
  - адрасацыя
    - 1 [адрасацыя камбінаваная]
    - [адрасацыя стандартная]
    - [адрасацыя экстранавігацыйная]
    - 2 [кластар адрасацыі]
      - 1 [кластар адрасацыі аднанакіраваны]
        - [кластар адрасацыі аднанакіраваны прагрэсіўна-рэгрэсіўны]
        - [кластар адрасацыі аднанакіраваны прагрэсіўны]
        - [кластар адрасацыі аднанакіраваны рэгрэсіўны]
      - [кластар адрасацыі двунакіраваны]
      - 2 [кластар адрасацыі бісубсідарны]
      - [кластар адрасацыі монасубсідарны]
      - [кластар адрасацыі полісубсідарны]
  - адсылка
    - [адсылка адыцыйная]
    - [адсылка аперацыйная]
    - [адсылка гіпера-гіпанімічная]
    - [адсылка ідэнтыфікацыйная]
    - [адсылка кантэнтная]
    - [адсылка рэляцыйная]
    - [адсылка экстранавігацыйная]
  - [індыкацыя]
    - [індыкатар літарны]
    - [індыкатар нумаральны]
    - [індыкатар пазіцыйны]
      - водступ абзацны
    - [індыкатар пунктуацыйны]
    - [індыкатар рэгістравы]
      - літара вялікая
      - літара малая
    - [індыкатар сімвальны]
    - [індыкатар шрыфтавы]
      - шрыфт курсіўны
      - шрыфт падкрэслены
      - шрыфт паўтлусты
      - шрыфт разрэджаны
  - памета
  - спасылка

VII. МІКРАСТРУКТУРА СЛОЎНІКА

- артыкул слоўнікавы
  - 1 [артыкул слоўнікавы даменны]
  - [артыкул слоўнікавы субсідарны]
  - 2 зона інфармацыі
    - 1 зона бібліяграфіі
    - зона дэрывацыі
    - зона ідэнтыфікацыі моўнай
    - зона ілюстрацый
    - зона інфармацыі граматычнай
    - зона інфармацыі лінгвадыдактычнай
    - зона інфармацыі сістэмнай
    - зона інфармацыі тэхнічнай
    - зона інфармацыі функцыянальнай
    - зона інфармацыі экстрапаняційнай
    - зона лакалізацыі
    - зона намінацыі
    - зона нумарацыі
    - зона пашпартызацыі
    - зона семантызацыі
    - зона эквіваленцыі
    - зона этымалагізацыі
    - 2 [функцыя зоны інфармацыі інтраканекцыйная]
    - [функцыя зоны інфармацыі экстраканекцыйная]

VIII. ПАРАМЕТРЫЗАЦЫЯ

- 1 параметр тэрмінаграфічны
  - [параметр тэрмінаграфічны знешні]
  - [параметр тэрмінаграфічны ўнутраны]
- 2 [параметрызацыя генетычная]
  - 1 [каментарый этымалагічны звужаны]
  - [каментарый этымалагічны пашыраны]
  - 2 [каментарый этымалагічны комплексны]
  - [каментарый этымалагічны фрагментарны]
- параметрызацыя граматычная
- параметрызацыя дэрывацыйная
- параметрызацыя ілюстрацыйная
  - [фамілізацыя]
  - цытацыя
  - экзэмпліфікацыя
    - [экзэмпліфікацыя асіндэтычная]
    - [экзэмпліфікацыя інкарпарацыйная]
    - [экзэмпліфікацыя інтрадукцыйная]

2 ├[экзэмпліфікацыя канекцыйная]
├[экзэмпліфікацыя лігаментацыйная]
├[экзэмпліфікацыя парантэзісная]
└[экзэмпліфікацыя тэрмінацыйная]
└эксплікацыя
├[параметрызацыя лакалізацыйная]
├[параметрызацыя моўная]
├[параметрызацыя намінацыйная]
└лема
1 ├лема бікампанентная
├лема монакампанентная
├лема полікампанентная
2 ├[лема дырэктыўная]
├[лема інверсійная]
3 ├[лема інтрадукцыйная]
├[лема экскрэтыўная]
4 ├[лема камплікацыйная]
└[камплікацыя]
1 ├[біфуркацыя]
├[кларыфікацыя]
├[полімарфізм]
├[полімарфізм анамасіялагічны]
├[полімарфізм анамасіялагічны афіксальны]
├[полімарфізм анамасіялагічны граматычна-семантычны]
├[полімарфізм анамасіялагічны кампанентны]
└[полімарфізм анамасіялагічны квантытатыўны]
├[полімарфізм інтэрмедыятыўны]
├[полімарфізм кантэкставы]
├[полімарфізм кантэкставы дыверсіўны]
├[полімарфізм кантэкставы камплементарны]
├[полімарфізм кантэкставы сепарацыйны]
└[полімарфізм кантэкставы юнітацыйны]
├[полімарфізм лексемны]
└[полімарфізм экстэрнальны]
├[спецыфікацыя]
2 ├[камплікацыя левалакунарная]
├[камплікацыя правалакунарная]
├[камплікацыя сіметрычная]
└[камплікацыя часткова-лакунарная]
5 ├лемізацыя
6 └[мадэляванне аднанакіраванае лінейнае]
└[параметрызацыя пашпартызацыйная]

2 параметрызацыя семантычная
- 1 дэфініцыя
  - 1 аманімія
  - полісемія
    - 1 [градацыя]
      - [градацыя вертыкальная]
      - [градацыя гарызантальная]
    - [інсертызацыя]
    - [лімітацыя]
    - [спецыфікацыя]
    - 2 [дыстрыбуцыя значэнняў]
      - [дыстрыбуцыя значэнняў гібрыдная]
      - [дыстрыбуцыя значэнняў дылатацыйная]
      - [дыстрыбуцыя значэнняў паралельная]
      - [дыстрыбуцыя значэнняў рэстрыкцыйная]
    - 3 філіяцыя
  - 2 дэфініендум
  - дэфініенс
  - 3 дэфініцыя аперацыйная
  - дэфініцыя астэнсіўная
  - [дэфініцыя патэтыўная]
  - 4 [дэфініцыя інтэрызаваная]
  - 5 дэфініцыя няяўная
  - дэфініцыя яўная
  - 6 [намінатар]
    - [намінатар дэскрыптыўны]
    - [намінатар класіфікацыйны]
    - [намінатар лакунарны]
    - [намінатар працэсуальны]
    - [намінатар фармальны]
    - [намінатар экстракцыйны]
    - [намінатар экстэнсіўна-экстракцыйны]
    - [намінатар экстэнсіўны]
  - [характарызатар]
    - 1 [характарызатар дыстынкцыйны]
      - [характарызатар арыгацыйны]
      - [характарызатар гібрыдны]
      - [характарызатар даміцыйны]
      - [характарызатар дэскрыптыўны]
      - [характарызатар прагматычны]
        - [характарызатар актыўна-пасіўны]
        - [характарызатар актыўны]
        - [характарызатар пасіўны]

2 | *1* | *6* | ├[характарызатар кампанацыйны]
2 ├[характарызатар інклюзіўны]
└[характарызатар катэнацыйны]
7 ├[уключэнне дэфініцыі акопульнае]
└[уключэнне дэфініцыі інтэрпункцыйнае]
└[уключэнне дэфініцыі копульнае]
2 └семантызацыя
1 ├[даменізацыя]
2 ├[семантызацыя камплетыўная]
├[семантызацыя кандыцыйная]
└[семантызацыя фрагментарная]
├параметрызацыя тэхнічная
├параметрызацыя функцыянальная
3 └прынцып параметрызацыі
├прынцып адназначнасці
├прынцып алгарытмізаванасці
├прынцып інтэраванасці
├прынцып несупярэчлівасці
├прынцып семантычнасці
├прынцып семіятычнасці
└прынцып тыпізаванасці
└[асістэмнасць субрэестравая]
├[асістэмнасць інтрасубрэестравая]
├[асіметрычнасць фрагментаў субрэестраў]
├[асістэмнасць дырэктыўна-інверсійная]
└[дубліраванне пермутацыйнае]
├[асістэмнасць субрэестравая гібрыдная]
└[асістэмнасць экстрасубрэестравая]
├[інтэграцыя тэрмінаў лакунарная]
├[інтэграцыя тэрмінаў незбалансаваная]
├[неідэнтычнасць адзінак субрэестраў]
├[сумарызацыя-дыферэнцыяцыя адзінак субрэестраў]
└[эквіваленцыя адзінак субрэестраў некарэктная]

КОРПУС ТЭРМІНАЎ

АБЗАЦ ↔ ВОДСТУП АБЗАЦНЫ

АДЗІНКА ЗАГАЛОЎНАЯ (ЗАГАЛОВАЧНАЯ, ЗАГАЛОЎКАВАЯ) ↔ ЛЕМА

АДЗІНКА ЛЕКСІЧНАЯ СПЕЦЫЯЛЬНАЯ ↔ ТЭРМІН

АДЗІНКА МОЎНАЯ СА ЗНАЧЭННЕМ СПЕЦЫЯЛЬНЫМ ↔ ТЭРМІН

АДЗІНКА РЭЕСТРАВАЯ ↔ ЛЕМА

АДРАСАЦЫЯ | 1

сродак *метамовы слоўніка*, з дапамогай якога ажыццяўляецца ўключэнне ў слоўнікавы артыкул інфармацыі пра тоеснасць семантычнага аб'ёму двух або больш рэестравых тэрмінаў.

Звычайна А. афармляецца з дапамогай тэрмінаграфічных памет "тое, што", "тое, што і", "тое ж, што", "тое ж, што і". У некаторых слоўніках пометы могуць суправаджацца збыткоўнай тэкставай інфармацыяй: "тэрмін, які абазначае тое ж, што і": "Злітныя зычныя – тэрмін, які абазначае тое ж, што і Афрыката. Гл. Афрыкаты", "Лінгвістыка – тое ж, што і Мовазнаўства (гл. Мовазнаўства)".

▲ *метамова слоўніка*

▼ *→ адрасацыя камбінаваная / адрасацыя стандартная / адрасацыя экстранавігацыйная;*
→ кластар адрасацыі

◄► *адсылка / індыкацыя / памета / спасылка*

АДРАСАЦЫЯ АДНАНАКІРАВАНАЯ ↔ КЛАСТАР АДРАСАЦЫІ АДНАНАКІРАВАНЫ

АДРАСАЦЫЯ АДНАНАКІРАВАНАЯ ПРАГРЭСІЎНА-РЭГРЭСІЎНАЯ ↔ КЛАСТАР АДРАСАЦЫІ АДНАНАКІРАВАНЫ ПРАГРЭСІЎНА-РЭГРЭСІЎНЫ

АДРАСАЦЫЯ АДНАНАКІРАВАНАЯ ПРАГРЭСІЎНАЯ ↔ КЛАСТАР АДРАСАЦЫІ АДНАНАКІРАВАНЫ ПРАГРЭСІЎНЫ

АДРАСАЦЫЯ АДНАНАКІРАВАНАЯ РЭГРЭСІЎНАЯ ↔ КЛАСТАР АДРАСАЦЫІ АДНАНАКІРАВАНЫ РЭГРЭСІЎНЫ

АДРАСАЦЫЯ КАМБІНАВАНАЯ | 2

тып *адрасацыі*, пры якой слоўнікавы артыкул складаецца з рэестравага слова, адрасацыйнай пазіцыі, аб'екта адрасацыі і дадатковых звестак – элементаў семантызацыі, ілюстрацый, функцыянальнай інфармацыі.

Напрыклад: "Фраза – найменшая самастойная адзінка маўлення, якая выконвае функцыю адзінкі зносін (тое, што Сказ)", "Прэдыкатыўная адзінка – тое, што Граматычны выказнік: Плача хмара без жалю, стогне вецер без болю (М. Танк)", "Прыдуўныя зычныя – тое ж, што і Шчылінныя зычныя. Тэрмін ужываецца рэдка" і інш.

▲ *адрасацыя*

◄► *адрасацыя стандартная / адрасацыя экстранавігацыйная*

АДРАСАЦЫЯ СТАНДАРТНАЯ | 3

тып *адрасацыі*, пры якой слоўнікавы артыкул складаецца з рэестравага слова, адрасацыйнай пазіцыі і аб'екта адрасацыі.

Напрыклад, у "Слоўніку лінгвістычных тэрмінаў" А. Л. Юрэвіча (1962): "Інхаатыў – тое ж, што і Інгрэсіў", "Лінгвістыка – тое ж, што і Мовазнаўства", "Прыдуўныя зычныя – тое ж, што і Шчылінныя зычныя" і інш.

▲ *адрасацыя*

◄► *адрасацыя камбінаваная / адрасацыя экстранавігацыйная*

АДРАСАЦЫЯ ЭКСТРАНАВІГАЦЫЙНАЯ | 4

тып *адрасацыі*, пры якой ажыццяўляецца перанакіраванне да іншай лексікаграфічнай або тэрмінаграфічнай крыніцы.

А. Э. можа афармляцца з дапамогай пазіцыі "параўн.":

"Алагізм – 1) адмаўленне лагічнага мыслення як сродку дасягнення ісціны; 2) знарочыстае парушэнне ў маўленні лагічнай сувязі з мэтай дасягнення пэўнага стылістычнага эфекту <...>.

Параўн.: алагізм (СЛТ, 1990, с. 16), (БелСЭ, I, с. 276), лагічныя памылкі (БелСЭ, VI, с. 239)".